**Шушкевіч, У.** Двойчы ў пекле вогненным / У. Шушкевіч // Лепельскі край. – 2006. – 25 крас. – С. 3.

## ДВОЙЧЫ Ў ПЕКЛЕ ВОГНЕННЫМ



Валодзя Семянько з Гарадчэвічаў у 1982 годзе закончыў гідрамеліірацыйны тэхнікум і атрымаў павестку ў армію. Цягнік доўга вёз навабранцаў ва Узбекістан. Тлумачэнняў не патрабавалася, што давядзецца ваяваць у Афганістане.

Тры месяцы ў Тэрмезе вучылі на мінамётчыкаў. У Афганістан закінулі самалётам, прызналі ахоўваць аэрадром. Гучыць празаічна, аднак вайсковую будзёншчыну спакойнай назваць нават з нацяжкай нельга. Амаль штодзённыя абстрэлы, налёты душманаў сталі звычайнай з'явай. Такія жахі салдатам нават у сне не сніліся дома.

За два гады Уладзімір памяняў некалькі месцаў службы. Скалясіў шмат афганскай зямлі, суправаджаючы калоны баявой тэхнікі. Ніводзін паход не праходзіў без нападаў душманаў. На іх шквальны агонь рота адказвала яшчэ больш смертаносным боем. Не лічыў тады, наш зямляк, колькі трупаў і астанкаў сяброў давялося яму пакласці ў цынкавыя дамавіны, колькі іх «чорны цюльпан» перавёз у Саюз, на радзіму.

Вобразна гарачым Афганистан быў круглы год. У рэальнасці ж сонца смажыла зямлю толькі летам. Зимой голыя скалы і бархханы апаноўвалі арктычныя халады.

Душманы былі добра инфармаваны і ўзброены. Аднойчы пачалі трапны абстрэл складоў з боепрыпасамі. Неба перамяшалася з зямлёй. Кананада штохвілінна нарастала. Адразу многія вартавыя былі забіты і паранены. Радавым Семянько з Беларусі і Рабаконю з Прыбалтыкі пашанцавала – засталіся жывымі. Яны кінуліся выцягваць з-пад абстрэлу параненых ахоўнікаў складоў. Не лічылі, колькі разоў пераадолелі маршрут ад эпіцэнтра агню да схаванай ва ўкрыцці санітарнай машыны. Было не да таго.

Подзвіг ратавальнікаў не застаўся незаўважаным. Воінаў-інтэрнацыяналістаў Семянько і Рабаконя ўзнагародзілі медалямі «За адвагу».

Дачакаўся Валодзя «дэмбеля», паехаў у Мінск вучыцца на прапаршчыка. У 1985 годзе ўжо служыў у Заслонаве. Ажаніўся. Атрымаў кватэру ў ваенным гарадку. Жонка Тамара нарадзіла дачку Лену.

У 1987 годзе ў вайсковую часць прыйшла разнарадка накіраваць у Афганістан прапаршчыка. Не бяруся асуджаць тых, хто ўсімі праўдамі і няпраўдамі пачаў адбівацца ад двухгадовай камандзіроўкі на вайну – каму хочацца падстаўляць лоб пад кулю. Не чапалі толькі Уладзіміра Семянько, бо паўторна ў тое пекла не пасылалі.

Цяпер і сам наш герой не можа ўзгадаць, што падштурхнула яго запісацца добраахвотнікам у Афганістан. Начальства толькі ўздыхнула з палёгкай.

Уладзіміра з улікам ранейшай практыкі прызначылі суправаджаць калоны вайсковай тэхнікі.

Напады, налады, напады... За дзень іх некалькі магло быць на калону. Уладзіміру зноў шанцавала – кулі і асколкі міналі яго.

Цяпер ужо не за канкрэтны выпадак, а за гераізм, праяўлены пры адбіцці масавых атак душманаў, нашага земляка ўзнагароджваюць медалём «За баявыя заслугі».

Уладзімір падпісваў кантракт на два гады. Прабыў у Афганістане крыху болып за год – пачаўся вывад «абмежаванага кантынгенту» на родную зямлю...

У Заслонаве прапаршчык Семянько служыў да 1994 года, пакуль не пачалося скарачэнне гарнізона. Перайшоў у Межыцу. Цяпер ён старшы прапаршчык. У брыгадзе супрацьпаветранай абароны служыць начальнікам склада боезапасу. Жонка працуе бухгалтарам у домакіраванні. Дачка пачынае працоўны шлях у Віцебску на абутковай фабрыцы. Сын – васьмікласнік. Жывуць у Заслонаве.

**Уладзімір ШУШКЕВІЧ**

**На здымку:** ***старшы прапаршчык Уладзімір Семянько***

**Фота аўтара**